стимулировало США развернуть новые ракеты, что могло бы привести к ядерной войне. Важно подчеркнуть, что есть договоры, которые так и не были подписаны в советское время, например, Договор об обычных вооруженных силах в Европе (ДОВСЕ). К тому же, такой шаг можно с уверенностью охарактеризовать как неожиданный: еще в 1985 году все ждали от дальнейших переговоров лишь «ругательной риторики».

Несмотря на это, Горбачев стал настоящим лидером, сумел своим напором и инициативой повести за собой массы, вернуть утраченное уважение к советскому лидеру, умение выстраивать отношения на принципах равенства и честного диалога. И, хотя, дальнейшие отношения вновь оказались под угрозой из-за распада СССР и дальнейшего ухудшения экономики, можно заключить, что советско-американские отношения – явно хороший пример для анализа с точки зрения достигнутых результатов.

*Источники и литература:*

1. Горбачев М.С. Понять перестройку…: Почему это важно сейчас / М.С. Горбачев. – М.: Альпина Бизнес Букс, 2006. – 400 с.
2. Отвечая на вызов времени. Внешняя политика перестройки: документальные свидетельства. По записям бесед М. Горбачева с зарубежными деятелями и другим материалам / Горбачев-фонд ; общ. ред. А.С. Черняева, А.Б. Вебера. – М.: Весь Мир, 2010. – 944 с.

## ХАЛОДНАЯ ВАЙНА І НОВАЕ МЫСЛЕННЕ Ў ЛЁСЕ МІНІСТРА ЗАМЕЖНЫХ СПРАЎ БССР А.Е. ГУРЫНОВІЧА

У.Е. Снапкоўскі (Мінск)

46-гадовы перыяд працы Міністэрства замежных спраў Беларускай ССР супадае з дзейнасцю двух міністраў: К.В. Кісялева (1944–1966) і А.Е. Гурыновіча (1966–1990). Постаць К. Кісялева значна больш вядома ў беларускай, як і ўвогуле агульнасаюзнай гістарыяграфіі, дзякуючы яго мемуарам, архіўнай спадчыне, што захоўваецца ў асобным фондзе НАРБ, кніжным і часопісным публікацыям, успамінам пра яго з боку савецкіх (расійскіх і беларускіх) дыпламатаў і замежных журналістаў. Аналізу дыпламатычнага стылю, дзейнасці, рыторыкі і паводзін К. Кісялева прысвечаны старонкі манаграфічных даследаванняў і асобныя публікацыі аўтара [8, с. 81–82, 86–88, 288–289; 9, с. 28–30, 35–37, 52–56]. Дзякуючы свайму неардынарнаму характару, часта адважным і часам непрадказальным учынкам, якія ён праяўляў як у першыя гады кіраўніцтва адноўленым Наркаматам, (з 1946 г.) Міністэрствам замежных спраў, так і ў апошні перыяд працы міністрам, К. Кісялеў увайшоў у гісторыю беларускай дыпламатыі як дзяржаўны дзеяч, які сфармуляваў "беларускі стыль савецкай дыпламатычнай школы". Яго дзейнасць разгортвалася на пераломе двух гістарычных эпох – заканчэння Другой сусветнай вайны і пачатку, потым абвастрэння халоднай вайны.

Постаць А. Гурыновіча (гады жыцця 1924–1999) стаіць бліжэй да нас па часе, але вядома пра яе менш. Мемуараў ён не пакінуў і, наколькі вядома, не пісаў. Публікацый меў значна менш за К. Кісялева: гэта брашура пра дзейнасць БССР у ААН у другой палове 1960-х – пачатку 1980-х гг. [2], некалькі артыкулаў у рэспубліканскіх і саюзных часопісах. Па характары ён быў больш стрыманым і закрытым чалавекам, менш амбіцыйным і публічным палітыкам, чым К. Кісялеў. У рэспубліканскай наменклатуры А. Гурыновіч займаў ніжэйшае месца ў параўнанні з папярэднікам, які перад вайной паспеў пакіраваць урадам БССР.

Калі К. Кісялева можна лічыць заснавальнікам, стваральнікам "беларускага стылю" савецкай дыпламатыі, то А. Гурыновіч быў прадаўжацелем і захавацелем гэтага стылю часоў брэжнеўскага застою і гарбачоўскай перабудовы. Супрацоўнікі беларускага МЗС пакінулі мала публікацый пра свайго міністра, што з'яўляецца сведчаннем пэўнай закрытасці нашага дыпламатычнага ведамства. У 2009 г. у МЗС Рэспубліікі Беларусь адбылася канферэнцыя з нагоды 85-годдзя А. Гурыновіча, дзе выступілі міністр С. М. Мартынаў, які быў яго памочнікам у 1980-я гг., ветэраны і дзеючыя супрацоўнікі міністэрства. Была арганізавана фотаэкспазіцыя. Аднак матэрыялаў канферэнцыі не было апублікавана.

Аўтар быў асабіста знаёмы з А. Гурыновічам, меў з ім некалькі сустрэч, аб чым напісаў у артыкуле, які зараз знаходзіцца ў друку. Мэтай дадзенага артыкула з'яўляецца далейшае набліжэнне да постаці былога міністра, якое мы спрабуем зрабіць на шырэйшым фоне развіцця міжнароднай палітыкі, дзейнасці ААН, савецкай знешняй палітыкі, узаемаадносін паміж федэральным цэнтрам і саюзнымі рэспублікамі ў сферах палітыкі, права і дыпламатыі. Храналагічна перыяд даследавання ахоплівае другую палову 1960-х – 1980-я гг.

Прасочым спачатку, якія важнейшыя дзяржаўныя, палітычныя і ведамасныя дакументы былі прынятыя ў часы міністэрскай працы А. Гурыновіча. З пункту гледжання размеркавання паўнамоцтваў паміж цэнтрам і рэспублікамі ключавое значэнне мелі палажэнні, зафіксаваныя ў саюзнай і рэспубліканскай канстытуцыях. Канстытуцыя СССР 1977 г. адносіла да кампетэнцыі Саюза ССР прадстаўніцтва СССР у міжнародных адносінах; устанаўленне агульнага парадку і каардынацыю адносін саюзных рэспублік з замежнымі дзяржавамі і міжнароднымі арганізацыямі; сувязі СССР з замежнымі дзяржавамі і міжнароднымі арганізацыямі; знешні гандаль і іншыя віды знешнеэканамічнай дзейнасці на аснове дзяржаўнай манаполіі (арт. 73) [6]. Арт. 28 Канстытуцыі БССР 1978 г. зацвердзіў, што рэспубліка "у знешнепалітычнай дзейнасці кіруецца мэтамі, задачамі і прынцыпамі знешняй палітыкі СССР, вызначанымі Канстытуцыяй СССР" [5]. Да іх саюзная канстытуцыя адносіла абарону дзяржаўных інтарэсаў СССР, умацаване пазіцый сусветнага сацыялізму, прынцыпы мірнага суіснавання і пралетарскага інтэрнацыяналізму.

У 2004 г. у 6-м томе выдання "Знешняя палітыка Беларусі. Зборнік дакументаў і матэрыялаў" была апублікавана справаздача МЗС БССР аб сваёй рабоце ў 1976 г., падпісаная міністрам замежных спраў А.Е. Гурыновічам [7, арк. 170–210; 4, с. 78–101]. Упершыню навуковая грамадскасць

атрымала магчымасць азнаёміцца са справаздачай МЗС саюзнай рэспублікі, у якой дастаткова поўна і грунтоўна паказаны ўсе аспекты дзейнасці знешнепалітычнага ведамства БССР у межах яго тагачасных паўнамоцтваў. Гэтай публікацыяй беларускія гісторыкі і архівазнаўцы апярэдзілі сваіх расійскіх і ўкраінскіх калегаў, якія да таго часу яшчэ не змаглі прадставіць на суд грамадскасці і вучоных штогадовыя справаздачы МЗС СССР і МЗС УССР, якія, як правіла, знаходзіліся на сакрэтным захоўванні ў адпаведных архівах.

Праўда аўтар меў магчымасць азнаёміцца і атрымаць копіі справаздачы МЗС СССР аб працы савецкай дэлегацыі на 22-й сесіі Генеральнай Асамблеі ААН у 1967 г. і справаздачы МЗС УССР за 1979 г. Параўнанне справаздач трох міністэрстваў замежных спраў (СССР, УССР і БССР) паказвае, што на форумах ААН паміж трыма савецкімі дэлегацыямі ажыццяўлялася несумненна самае цеснае дыпламатычнае супрацоўніцтва пад кіраўніцтвам дэлегацыі СССР, аднак нават у сакрэтных дакументах трох міністэрстваў замежных спраў таго часу аб гэтым лічылі за лепшае не згадваць ці не акцэнтаваць увагі, лічачы гэта само сабой зразумелым. Гэтая заўвага ў першую чаргу тычыцца саюзнага МЗС, які, верагодна, апасаўся абвінавачванняў і папрокаў (небезпадстаўных) у дыктаце, апецы, кантролі над рэспубліканскімі міністэрствамі замежных спраў. Асаблівасцю ўкраінскай справаздачы было фармуляванне 8 змястоўных прапаноў у адрас МЗС СССР, чаго не асмеліўся зрабіць беларускі міністр. Ва ўкраінскім дакуменце гаворыцца аб супрацоўніцтве дэлегацый Савецкага Саюза, брацкіх сацыялістычных краін у ААН, аднак дэлегацыя БССР не згадваецца. Тое ж самае тычыцца і неўпамінанне дэлегацыі УССР у справаздачы МЗС БССР за 1976 г. [10, с. 56–58].

Яшчэ адзін дакумент таго часу, да распрацоўкі і прыняцця якога несумненна меў дачыненне А. Гурыновіч, гэта пастанова ЦК КПБ ад 29 сакавіка 1976 г. «Об участии министерств и ведомств республики в деятельности международных организаций системы ООН». Вышэйшы партыйны орган рэспублікі на ўзроўні бюро ЦК упершыню комплексна разгледзеў дзейнасць органаў дзяржаўнага кіравання ў міжнародных арганізацыях сістэмы ААН і прыняў спецыяльную пастанову па гэтым пытанні. У ёй адзначалася, што міністэрствы і ведамствы рэспублікі актыўна ўдзельнічаюць у рэалізацыі ленінскага знешнепалітычнага курсу КПСС і Савецкай дзяржавы, выкарыстоўваюць міжнародныя арганізацыі сістэмы ААН для вывучэння і ўкаранення ў народную гаспадарку перадавога замежнага вопыту, прапаганды дасягненняў савецкага народа ў камуністычным будаўніцтве, прасоўвання спецыялістаў у сакратарыяты міжнародных арганізацый [4, с. 14].

Разам з тым ЦК КПБ указаў на тое, што ў рабоце міністэрстваў і ведамстваў рэспублікі па выкананні рашэнняў ЦК КПСС у галіне дзейнасці міжнародных арганізацый сістэмы ААН меўся шэраг істотных недахопаў і нявыкарыстаных магчымасцей. Мала ўвагі ўдзялялася сістэматычнай распрацоўцы ініцыятыўных прапаноў для ўключэння ў праграмы работы міжнародных арганізацый навукова-тэхнічнага характару. Кіраўніцтва МЗС БССР і Пастаяннага прадстаўніцтва БССР пры ААН не заўсёды прад'яўлялі належную патрабавальнасць да сваіх супрацоўнікаў і асоб, якія

камандзіруюцца на працу ў міжнародныя арганізацыі. У рэспубліцы выкарыстоўваліся не ўсе магчымасці для правядзення мерапрыемстваў па лініі міжнародных арганізацый сістэмы ААН. Пастанова на гады наперад вызначыла кірункі дзейнасці МЗС БССР [4, с. 14–19; 8, с. 201–205].

У 1988 г. рэспубліканскае МЗС нарэшце атрымала ўстановачны дакумент аб сваёй дзейнасці, пра неабходнасць якога неаднаразова выказваўся міністр, асабліва, калі яму задавалі пытанні аб самастойнасці ці залежнасці міністэрства. 25 кастрычніка 1988 г. Савет Міністраў БССР зацвердзіў Палажэнне аб Міністэрстве замежных спраў БССР. У ім адзначалася, што МЗС БССР з'яўляецца саюзна-рэспубліканскім міністэрствам і ў сваёй дзейнасці падпарадкоўваецца як Савету Міністраў БССР, так і МЗС СССР. У сваёй дзейнасці МЗС БССР кіравалася прынцыпамі ленінскай знешняй палітыкі, законамі СССР і БССР, рашэннямі вышэйшых органаў дзяржаўнай улады СССР і БССР, міжнароднымі дагаворамі СССР і БССР, інструкцыямі і ўказаннямі МЗС СССР і іншымі нарматыўнымі актамі. Галоўнымі задачамі МЗС БССР з'яўляліся: забеспячэнне ў межах сваёй кампетэнцыі рэалізацыі знешнепалітычнага курсу КПСС і Савецкай дзяржавы; умацаванне і ўдасканаленне замежных сувязей БССР, у тым ліку з міжнароднымі арганізацыямі; абарона інтарэсаў БССР і СССР у цэлым , а таксама грамадзян БССР у пытаннях узаемаадносін з замежнымі краінамі і міжнароднымі арганізацыямі. У Палажэнні падкрэслівалася, што дыпламатычная служба БССР з'яўляецца састаўной часткай дыпламатычнай службы СССР [4, с. 271–276].

Палажэнне аб Міністэрстве замежных спраў БССР адлюстравала рэальны стан федэратыўных адносін у савецкай шматнацыянальнай дзяржаве, размеркаванне ўладнай і прававой кампетэнцыі паміж саюзнымі і рэспубліканскімі органамі ў галіне знешняй палітыкі ў канцы 1980-х гг. Нягледзячы на вельмі шырокі і разнастайны характар функцый і задач, ускладзеных на беларускае знешнепалітычнае ведамства, на практыцы яно не мела самастойнасці ці мела яе вельмі мала і павінна было практычна ўсе пытанні знешнепалітычнай дзейнасці рэспублікі ўзгадняць у Маскве.

У працэсе дэмакратызацыі фэдэратыўных адносін саюзныя рэспублікі паставілі пытанне аб пашырэнні сваіх правоў за кошт некаторага змяншэння звышцэнтралізацыі ў дзейнасці саюзных органаў і ведамстваў, у тым ліку МЗС СССР. Пасля нарады міністраў замежных спраў саюзных рэспублік (чэрвень 1987 г.) кіраўніцтва МЗС СССР прыняло шэраг мер, каб надзяліць рэспубліканскія МЗС больш шырокімі паўнамоцтвамі. У 1989 г. у складзе саюзнага МЗС быў створаны аддзел па саюзных рэспубліках.

На старонках часопіса «Международная жизнь» адбыўся абмен думкамі паміж міністрамі замежных спраў шэрагу саюзных рэспублік. Яны далі даволі крытычную ацэнку таму становішчу, у якім знаходзіліся рэспубліканскія знешнепалітычныя міністэрствы, прыціснутыя дыктатам і кантролем саюзных органаў улады. Па прызнанні міністраў, МЗС СССР, Вярхоўныя Саветы і Саветы Міністраў саюзных рэспублік удзялялі недастатковую ўвагу дзейнасці рэспубліканскіх МЗС, задавальненню іх запытаў і патрэб [10, с. 22–24].

Міністр замежных спраў БССР А. Гурыновіч упадабаў іншую танальнасць і падыход у ацэнцы гістарычных і сучасных форм адносін рэспублікі з саюзнымі органамі ў знешнепалітычнай сферы. Ён казаў пра гонар беларускіх дыпламатычных работнікаў за дасягненні сваёй Радзімы, аптымізм, з якім яны глядзяць у будучыню, перавагі сацыялізму і выніках стваральнай працы, якія сталі магчымымі дзякуючы брацкаму супрацоўніцтву народаў Краіны саветаў. Асобная ўвага была звернута да новых формаў і метадаў знешнеэканамічнай дзейнасці, якая ажыццяўлялася праз агульнасаюзныя знешнія гандлёвыя органы і прыгранічны гандаль, а таксама да працы з суайчыннікамі [1, с. 68 –69].

А. Гурыновіч адрэагаваў на новыя веянні ў рыторыцы і падыходах савецкай дыпламатыі з акцэнтамі на маральных прынцыпах у палітычным мысленні і дзеях і сфармуляваў маральна-палітычнае крэда беларускага МЗС часоў перабудовы і новага мыслення: «Внешнеполитической деятельности Белорусской ССР присущи последовательность и принципиальность, нетерпимость к несправедливости, а соответственно и аргументированный, деловой отпор тем, кто подменяет принципы сотрудничества конфронтацией и нападками». Новым словам у палітычным лексіконе быў тэрмін «белорусская дипломатия», упершыню ўжыты міністрам у публічным дыскурсе. Як ужо гаварылася, у Палажэнні аб МЗС БССР падобнага тэрміну не ўжывалася, а дыпламатычная служба БССР лічылася састаўной часткай дыпламатычнай службы СССР. Па словах міністра, «усилия белорусской дипломатии подчинены активному участию в осуществлении главных целей и направлений международной политики КПСС и Советского государства» [1, с. 70].

Перабудова і новае мысленне паставілі перад беларускім МЗС і асабіста міністрам цяжкія задачы, якія не даводзілася вырашаць раней. Самай складанай з іх было пераадоленне рыторыкі і прапаганды халоднай вайны і канфрантацыйнага мыслення. Гэтая навізна сітуацыі далася ў знакі ўжо ў першы год перабудовы, аб чым сведчыў удзел дэлегацыі БССР у 40-й сесіі Генеральнай Асамблеі ў 1985 г. Дзякуючы выдадзенай у 1986 г. кнізе з уступным артыкулам А. Гурыновіча навуковая грамадскасць атрымала магчымасць прасачыць пазіцыі савецкай дыпламатыі і яе беларускага атраду па найбольш важных пытаннях парадку дня. Было заўважна, што ацэнкі беларускага міністра разыходзіліся з выказваннямі і меркаваннямі М. Гарбачова і міністра замежных спраў СССР Э. Шеварнадзе, накіраванымі на пошук кампраміса і дыялогу з Захадам [3, с. 6–7].

Несумненна, што ў звыклых і осуджальных ацэнках заходніх дзяржаў адбівалася інерцыя мыслення А. Гурыновіча, які прайшоў цяжкую школу халоднай вайны, пачынаючы з апошніх гадоў сталінскай дыпламатыі, калі ён стаў працаваць у беларускім МЗС. У 1986 г. ён быў ужо вопытным дыпламатам, займаючы пасаду міністра замежных спраў 20 гадоў, які ў сваёй крытыцы ЗША і Захаду мог ісці далей, чым саюзныя дыпламаты і палітыкі. У вырашэнні гэтай важнейшай палітыка-ідэалагічнай задачы савецкай дыпламатыі (асуджэнне і крытыка палітыкі Захаду) Масква дазваляла значную ступень самастойнасці рэспубліканскай дыпламатыі, якой Мінск карыстаўся больш і актыўней, чым Кіеў [8, с. 267–273].

Пры А. Гурыновіче знешнепалітычная дзейнасць БССР дасягнула свайго паталка як у галіне шматбаковай дыпламатыі, так і развіцця замежных сувязей з урадавымі і грамадскімі арганізацыямі іншых дзяржаў. З'явіліся новыя формы і метады знешнеэканамічнай дзейнасці, наладжваліся сувязі з замежнымі суайчыннікамі. На сесіях Генеральнай Асамблеі, якія праходзілі ў больш спрыяльных міжнародных умовах, дух канфрантацыі і палемікі стаў выцясняцца ў выступленнях беларускіх дыпламатаў выказваннямі на карысць дыялогу і кампрамісу. У цэлым дыпламатычны стыль беларускіх прадстаўнікоў «эпохі Гурыновіча» можна ацэньваць як традыцыйна-стрыманы або ўмерана кансерватыўны.

У лёсе А. Гурыновіча спалучыліся дзве гістарычныя эпохі – халоднай вайны і савецкай перабудовы. Ён сфарміраваўся і дзейнічаў як прадстаўнік беларускага атрада савецкай дыпламатыі эпохі канфрантацыі з Захадам. Прыход перабудовы і палітыкі новага мыслення, якая асабліва выразна праявілася ў савецкай палітыцы на форуме ААН, паставілі перад міністрам і беларускім МЗС новыя, неардынарныя па маштабах задачы. Выконваючы лінію партыі, А. Гурыновіч разам з тым не спяшаўся пераглядаць гістарычныя ацэнкі адносін паміж цэнтрам і рэспублікамі і адыходзіць ад звычайнай практыкі асуджэння і крытыкі палітыкі ЗША і іншых заходніх дзяржаў. На працягу пяці гадоў перабудовы аж да сваёй адстаўкі ў ліпені 1990 г. ён заставаўся носьбітам традыцыйнага стылю беларускай савецкай дыпламатыі.

*Источники и литература:*


1. Гуринович, А.Е. Дипломатия Белоруссии [Электронный ресурс] / А.Е. Гуринович // Международная жизнь. – 1988. – № 4. – Режим доступа: https://naukaprava.ru/catalog/435/840/56238/60926?view=1. – Дата доступа: 12.04.2022.
2. Гуринович, А.Е. Участие Белорусской ССР в деятельности ООН / А.Е. Гуринович. – Минск : Беларусь, 1982. – 143 с.
3. За мир и сотрудничество между народами: Участие Белорусской ССР в 40-й сессии Генеральной Ассамблеи ООН / сост. С.Н. Мартынов ; вступит. ст. А.Е. Гуриновича. – Минск : Беларусь, 1986. – 198 с.
4. Знешняя палітыка Беларусі : зб. дакументаў і матэрыялаў : у 10 т. / М-ва замеж. спраў Рэспублікі Беларусь, БДУ, БелНДІДАС. – Мінск : БДУ, 1997–2014. – Т. 6 : 1976 г. – верасень 1991 г. / склад.: У.К. Ракашэвіч, А.В. Шарапа. – 2003. – 335 с.
5. Конституция (Основной Закон) Белорусской Советской Социалистической Республики. Минск, 1978 г. [Электронный ресурс] // Национальный центр правовой информации Республики Беларусь. – Режим доступа: http://www.pravo.by/lawhistory/konst_1978_original.htm. – Дата доступа: 12.04.2022.
6. Конституция (Основной Закон) Союза Советских Социалистических Республик. Принята на внеочередной седьмой сессии Верховного Совета СССР девятого созыва 7 октября 1977 г. [Электронный ресурс] // Исторический факультет Московского государственного университета имени М.В. Ломоносова. – Режим доступа: http://www.hist.msu.ru/ER/Etext/cnst1977.htm#iii. – Дата доступа: 12.04.2022.
7. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 4п. Воп. 118. Спр. 19.
8. Снапковский, В.Е. Белорусская ССР в ООН: отряд советской дипломатии в действии / В. Е. Снапковский. – Минск : Право и экономика, 2021. – 318 с.
9. Снапкоўскі, У.Е. Знешнепалітычная дзейнасць Беларусі: 1944–1953 гг. / У.Е. Снапкоўскі. – Мінск : Беларуская навука, 1997. – 207 с.
10. Снапкоўскі, У.Е. Традыцыі і навацыі ў знешнепалітычных даследаваннях Беларусі : дапаможнік / У.Е. Снапкоўскі. – Мінск : БДУ, 2020. – 290 с.